архівы

## Навум Кісьлік



...калі праўда табе шкодзіць,
то што ты з сябе ўяўляеш?..

# «Сьляды яшчэ ня сьцертыя»

***З дзёньніка***

***«...З тае пары, калі Кісьлікава пяро запаўняла знойдзены намі нататнік, прайшло больш за тры дзесяцігоддзі, у нашай краіне і ў сьвеце адбыліся велічэзныя зьмены, і шмат з таго, што адвяргаў Кісьлік, што з едкім сарказмам высьмейваў і сьцябаў, сышло з нашага жыцьця. Але, да няшчасьця, далёка ня ўсё. Большасьць запісаў – быццам сёньня занесеныя ў нататнік, настолькі яны сугучныя нашым дням, азмрочаным пагрозай новага таталітарызму, нахабным выхадам на сцэну старых знаёмцаў – антысемітызму і ксенафобіі. Правалены сталінскі сьпектакль спрабуюць паставіць зноў...»***

Публікатары дзёньніка
А. Дракахруст, В. Тарас

*2.05.72*

Дойліды, мастацтвазнаўцы, заклапочаныя старасьвеччынай дзяўбуць: «Цэрквы руйнуюць, бо ў Маспраекце заселі я н ы...»

Прыгадваецца п’яны... на лавачцы на бульвары нашым: «Будзе вайна, – усіх вас, жыдоў, перарэжам...»

...На пленуме ВТА «навуковец» Няфёд раскрытыкаваў «ЛіМ», пералічваючы вядомага гатунку імёны.

Асабліва цікавая версія пра імкненьне да ўлады... «Савецкая ўлада – жыдоўская». Немцы таксама гэтым карысталіся.

...Ліст ананімны нейкага «простага рабочага» ў радыёкамітэт: «Яны нам у сьпіну нажом, калі вайна будзе...»

...Нішто – усё праўдзіва пражытае жыцьцё, уся шчыра пралітая кроў – не абараняе чалавека перад абліччам усемагутных, усёуладных правакатараў...

111

Іхняя «справа» пазбаўленая глыбіні, душы, ісьціннай веры. «Прыстасоўваюцца» для зьнешняга добрабыту – і толькі ў гэтым іхняя моц, дакладней, слабасьць.

111

4.05.72

Самы вялікі недахоп у мастацтве – лішак.

111

Таталітарныя дзяржавы і арганізацыі часам дзейнічаюць гэтак, як думаюць і адчуваюць масы. Гэта адбываецца ня толькі з патрэбы дэмагогіі, але і таму, што таталітарызм зьяўляецца носьбітам масавай, пошлай, абывальскай сьвядомасьці. Пошласьць, наогул, неад’емная рыса любога рэакцыйнага рэжыму, усялякай рэакцыі.

111

*29.06.72*

Таксі. Пасажыр: — А як у народзе пра гэта мяркуюць? Пра Сталіна?

Шафёр: — Ён... гэта... даверлівы быў... памочнікам сваім давяраў.

111

Сацыяльна-псіхалагічная сітуацыя, пры якой рэтраград лічыць сябе прагрэсістам, прыгнятальнік – вызваліцелем, шавініст – інтэрнацыяналістам, індывідуаліст – калектывістам, трафарэтчык – творцам.

111

Ня мае значэньня – вольныя вершы ці нявольныя – абы ня лёкайскія.

111

Усялякая незаслужаная пакута, прыніжэньне, боль, страх, цяжкое душэўнае ўзрушэньне, на якія такі шчодры наш век – як ведаць? – ці не застануцца мінай запаволенага дзеяньня ў генах, ці ня выбухнуць у наступных пакаленьнях. Ці ня выбухне мінулае ў будучыні. Вось гэта – куды больш глыбокае значэньне таго, што «нішто не забыта».

111

(Запіс пра магчымую эміграцыю блізкага яму Барыса Заборава, цяпер вядомага мастака, які зьехаў у Парыж).

Што я магу яму запярэчыць? Ці магчыма так надалей існаваць? Псіхалагічна і маральна гэта робіцца ўжо зусім невыносным. І, калі няма страху перад разрывам натуральных (і гістарычных) сувязяў (і культурных, дадамо), тое што ж?

І ўсё-ткі – цяжка, амаль немагчыма ўявіць падобнае для сябе.

111

...Словы самога Авечкіна: «Не давядзі Гасподзь памятаць толькі подпісы на рэйхстагу і забыцца пра Керч, забыцца пра немцаў пад Эльбрусам».

...Усялякая няўладзіца быцьця пераадольная толькі тады, калі яе ясна ўсьведамляюць, наўпрост называюць, адкрыта пераадольваюць. Ва ўмовах рэпрэсіяў, у недэмакратычнай сітуацыі ніякія высільваньні падкруціць тую ці іншую шрубку не дадуць рашэньня праблемы.

111

Машына для абалваньваньня іншых абалваньвае і саміх апаратараў.

111

Наіўнае абывательскае мысьленьне пераканана, што ўсялякі, хто ваяваў з нямецкім фашызмам – антыфашыст, што ўсё, супрацьпастаўленае якойсьці аднной пэўнай форме ліха, ёсьць дабро.

111

...А кола інтарэсаў духоўных! Усеагульнае ажыўленьне выклікала ўсім цікавая тэма, калі за сталом загаварылі пра нейкіх эстрадна-тэлевізійнага сьпевака ці сьпявачку... Ды яшчэ – выключаючы жанчын – спартыўныя жарсьці.

Усё духоўнае жыцьцё большасьці так званых інтэлігентаў: 1. Заробак – кар’ера. 2. Выпіўка. 3. Тэлевізар. Хакей – футбол – шахматы.

Усё гэта самае передавое ў сьвеце.

111

*4.05.74*

Узрушальны сюжэт для прозы ХХ-га стагоддзя, які распавяла старая камсамолка, значная партдзяячка ў мінулым.

...Камсамолка, закінутая для падпольнай працы ў буржуазную Польшчу, у турме сыходзіцца з гуртком польскіх левых студэнтак – маладзенькіх дзяўчатак. Аказвае на іх велічэзны маральны, духоўны ды ідэйны ўплыў. Яны бачаць у ёй узор новага чалавека новага сьвету. Гэты ўплыў вызначае жыцьцёвы шлях большасьці з іх.

Дзесьці ў 39-40-х гадах на «перасылцы» на Далёкім Усходзе адна з зэчак, палячка, распавядае суседцы па нарах гісторыю свайго жыцьця, што вызначалася пад уплывам той турэмнай сустрэчы, таго маральнага ўзору. У ейных словах жыве захапленьне той самай камсамолкай.

Зэчка заканчвае свой расповяд словамі: «Яна, павінна быць, у іх – вялікі чалавек. Вось бы знайсьці яе, паслаць ёй паведамленьне – яна б мяне ўратавала».

А слухачка, суседка па нарах на перасылцы, – гэта тая самая, хто вызначыла маральны (ды і фізічны) лёс распавядальніцы, не пазнаная ёю, і сама не наважылася адкрыць сябе...

111

Гэта цень, які бяжыць за намі, шкодзіць спакойнаму сузіраньню, без якога цяжка

быць пісьменьнікам. Калі сядаеш за стол, патрэбна душэўная раўнавага – бяз гэтага ўсё будзе няпраўдзіва, павярхоўна. Кідаешся на першыя, што патрапілі пад руку, словы, на банальшчыну, павярхоўныя пачуцьці – песімізм, аптымізм ды астатнія эмацыйныя «ізмы».

111

Самалёт, які ўгналі ў Турцыю два літоўцы, на якім ляцела Зіна (стрыечная сястра Н. Кісьліка. – *А.Д., В.Т.*), адзіная з усіх не разгубілася і ўратавала параненага лётчыка, аказалася, угналі – я н ы.

Апроч таго мусоліцца версія, што «яны» вінаватыя ў паразах пачатковага перыяду вайны.

Жонка К.: «Калі б у вас былі добрыя знаёмыя ў органах, вы б даведаліся, якую шкоду прыносяць яўрэі нашай дзяржаве».

Якія органы маюць у якасьці добрай знаёмай жонку К.?

111

...Людзі, якія расцэньваюць тваю шчырасьць, як адзнаку глупства...

111

М. Шкерын (літкрытык з кочэтаўскага «Октября». – *А.Д., В.Т.*) учыніў дзікі скандал у сталоўцы нейкага санаторыя, калі яму падалі страву, што называецца «цымес». Гэты страўнік быў абражаны ў лепшых сваіх пачуцьцях і доўга шалеў. Апроч іншага, бо нат у самой назве заключаная сьмяротная для праваслаўна-сацрэалістычнага жывата атрута.

Такая вартасьць заалогіі.

111

Яшчэ і не пасьпеўшы – аж за чвэрць стагоддзя! – выпрацаваць сьветасузіраньне, усе пайшлі паасобку. Відавочна ўсьведамляеш, што, па сутнасьці, адзінства бачаньня і адчуваньня і не было – была ілюзія супольнасьці.

І якую толькі лухту не вярзуць людзі пад уціскам жарсьцяў цалкам асабістых, асабістых сітуацыяў, спрабуючы на гэтых жарсьцях збудаваць пасьпешліва нейкае падабенства тэорыі; замест таго, каб падвергнуць эмоцыі суду розуму, падманваюць яго падачкай – тэарэтычным эрзацам... Але гэтага, стаецца, дастаткова для цалкам лагічнага мозгу. Бо... знойдзены «вінаваты» ў няўдачах. Для чалавека, які мысьліць – ганебная слабасьць шукаць суцяшэньня замест ісьціны.

111

І. кажа, што немец дайшоў да Масквы, бо габрэі атруцілі студні. Ён нават не падазрае, што прымітыўны сярэднявечны міф у дваццатым стагоддзі падаецца ў сучаснай упакоўцы... Цалкам верагодна, што гэта самадзейная змрочная юдафобская фантазія. Ня выключана, аднак, што тут дзейнічаюць знарок. Прынамсі, злучэньне зламыснасьці з ідыятызмам – самае верагоднае. Так для цёмнай сьвядомасьці здымаецца адказнасьць з сапраўдных вінаватых.

«Казёл адпушчэньня» ў самым ягоным першабытным варыянце – магутны для іх сродак сацыяльнай абароны. Ніколі яны ад яго не адмовяцца, не адмовяцца ад магчымасьці ў сваіх класавых інтарэсах эксплуатаваць сярэднявечча ці нават першабытнаабшчынныя пласты народнай сьвядомасьці.

Якое цёмнае варыва булькоча пад дабрадзейнай часам, пад бліскучай накрыўкай каструлі гэтай! Але ці не давядзецца самім «кухарам» сёрбаць гэтую поліўку?

111

Калі праўда табе шкодзіць, то што ты з сябе ўяўляеш?

111

«Антысемітызм зьяўляецца зручным... рэвалюцыйным (sic!) сродкам масавай прапаганды ва ўсіх краінах, зьяўляецца амаль неабходнай умовай для правядзеньня нашай палітычнай кампаніі. Вы пабачыце, як мала часу будзе запатрабавана дзеля таго, каб перакрэсьліць уяўленьні і крытэрыі ўсяго сьвету толькі і проста з дапамогаю наскокаў на яўрэйства. Па-за ўсякім сумневам – гэта самая магутная зброя ў маім прапагандысцкім арсенале». А. Гітлер. («Нюрэнбергскі працэс», 1957 г. выд., т. 4, стар. 58)

Вось яна — «міжнародная мова фашыстаў»! А. Энштэйн.

111

Мой прыяцель у свой час паслаў у адну рэдакцыю вершы пад назваю: «Час праўды», і атрымаў адказ: «Вашыя вершы несвоечасовыя».

111

Бацька сказаў: «Вы не баіцеся за сябе, і гэта ваша праўда. Але я баюся за вас – і мая праўда яшчэ большая».

111

Большасьць сучаснай рускай інтэлігенцыі ня толькі спакойна паглядае на разбэшчваньне «малалетніх», што адбываецца на ейных вачах, але і заражаецца псіхалогіяй разбэшчвальнікаў... «Добра. Мы-то можам зьбегчы ад вас, – кажу. – Вы-то – куды ад сябе?»

...Але давайце, панове, паглядзім на сябе збоку. Як гэта выглядае, калі вялікая нацыя, замест таго, каб шчыра і мужна асэнсаваць сваю ўласную гісторыю, займаецца вельмі суцяшальнымі, але баязьлівымі пошукамі казла адпушчэньня...*

* Навум Кісьлік пісаў свой дзёньнік трыццаць гадоў таму.